Бабярэнка Я.І., студ. гр. 414
ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Гуд П.А.,
прафесар

# ФАЕР-ШОЎ У БЕЛАРУСІ: ГІСТОРЫЯ, ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Фаер-шоў (eng. Fire show) ці агністае шоў, кручэнне агню (eng. Fire twirling, hobby-circus) – адна з разнавіднасцяў вулічнага цыркавога выступлення, традыцыйнае мастацтва, якое складаецца ў выкананні акрабатычных прыёмаў са снарадам, увянчаным адным ці некалькімі падпаленымі кнотамі”.

Узнікла фаер-шоў на ўзбярэжжы Ціхага акіяна ў новазеландскага племя Маоры. Першаадкрывальнікі знайшлі ў мясцовых жыхароў этнічную прыладу поі – хараша ўпрыгожаны шарык, замацаваны на вяроўцы, з якім яны танчаць. Людзі зацікавіліся і паспрабавалі рабіць гэта з агнём .Для мясцовых абарыгенаў вытанчанае кручэнне невялікага каменьчыка, абгорнутага ў тканіну і прывязанага на кароткую вяроўку (поі) служыла як забаўляльным, так і культавым мэтам. Часцей замест каменьчыка абарыгены выкарыстоўвалі мякчэйшы напаўняльнік, напрыклад, поўсць ці карані раслін. “Поі” для маоры – гэта цэлы набор паняццяў і павер'яў. Так, напрыклад, яны выкарыстоўваліся для прыцягнення ўвагі партнёра процілеглага полу. Поінг – гэта нацыянальнае мастацтва. Да сённяшняга часу племя захоўвае традыцыі валодання поі. Дадзены танец застаецца абавязковай часткай дзяржаўных імпрэз, свят і г.д.

У шасцідзесятых гадах XX ст. трупы цыркаў шапіто, якія гастраліравалі па Аўстраліі, узялі сабе “на ўзбраенне” новы фармат агністых нумароў. Агністае шоў цяпер ёсць неад'емная частка практычна кожнага цыркавога відовішча. Так , у 60х-70-х гадах мінулага стагоддзя, ужо ў Заходняй Еўропе і ў Амерыцы з'яўляюцца фаер-шоў – танцы з агнём пад бой барабанаў і бубнаў.

У Беларусі гэты рух з'явіўся ў 90-ых гадах XXст. На сучасным этапе існуе больш 10 тэатраў, якія спецыялізуюцца на такіх выступленнях, і не злічыць тых, хто займаецца гэтым самастойна. Такіх “самавукаў” каля 1000 толькі ў Менску, з кожным годам іх становіцца больш і ў правінцыйных гарадах.

У нашай краіне ў фаер - культуры развіваюцца дзве плыні: аматары і прафесійныя “агністыя тэатры”. Гэта “Элементаль”, “Дыгрыза”, “Крэсіва” і інш, якія працуюць прыкладна на адным узроўні. Найбольш вядомым прадстаўніком беларускай школы агнявых шоў на сусветным узроўні з’яўляецца “Шальмоўскі Тэатр Ды Грыза”, які быў створан у 2005 годзе. Рэгулярна выступае ў Польшчы, Фінляндыі, Нямеччыны і Нідэрландах, Венгрыя і інш. Некаторыя з іх дасягненняў: 1-ае месца ў спаборніцтве Агневых Тэатраў з сумесным праектам “Шабаш” (г. Бычына, Польшча); кіраўнік тэатру займае першае месца ў раенным спаборніцтве педагагічнага майстэрства “Праз Творчасць да Посьпехаў” і становіцца лепшым кіраўнікам гуртка Цэнтральнага раена г. Мінска за 2007 год. Тэатр з'яўляецца ўдзельнікам Асацыяцыі гістарычнага танцу (СНД). Цікавіць іх незвычайны падыход да вогненных дзей: яны не абмяжоўваюцца стварэннем вогненных відовішч, а захапляюць гледача цэлымі спектаклямі. Складана не адмеціць вогненныя спектаклі “Алхімік”, “Вайдэлотка”, “Жрыца” і “Вядзмарка” (пастаноўка заняла першае месца сярод 13 удзельнікаў з Беларусі і Польшчы).

Адным з галоўных шоў у гэтай галіне з'яўляецца вогненны цырк “Kresiva”, які быў створан у 2005 годзе. Кіраўніком яго з'яўляецца Вячаслаў Грыздак, а калектыў налічвае каля 50-ці чалавек, але асабіста фаер-шоў займаюцца 15. Усе акцеры – прафесіянальныя артысты цырка, спарцмены, каскадзеры. На іх ліку рэалізацыя каля 1500 шоў рознага ўзроўня прызначаных як для карпаратываў, так і для свята горада, міжнародных конкурсаў. Прычым іх дзейнасць не абмяжоўваецца толькі вогненным шоў. Яны таксама ўладкоўваюць рыцарскія турніры, неонавае шоў, пластычныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

танцы і тэатральныя нумары на хадулях, фрык-шоў. Цырк “Kresiva” з'яўляецца частым госцем менскіх клубаў. Калектыў дамогся даволі вялікіх вышынь: яны выступалі на “Фабрыцы зорак” у Маскве, у праекце СТВ у Віцебску. У 2010 годзе атрымалі ўзнагароду як лешы эксклюзіў Беларусі сярод прафесіяналаў.

Калектыў “Krada” самастойна пачаў працаваць з 2008 года. Да гэтага яго ўдзельнікі выступалі ў  танцавальным театры “Гістрыен”. Пазней яны вырашылі паспрабаваць сябе ў новым калектыве “Krada” – танцавальным фаер-шоў, неон-шоў з элементамі тэатральных пастановак. На сеняшні дзень іх толькі 6 чалавек, якія ўжо выступалі ў Беларусі на шматлікіх святах, Польшчы, Украіне. Калектыў плануе расшырацца і ствараць “вогненныя” спектаклі. У 2011 годзе “Krada” прапанаваў сваім гледачам пастаноўку “Лялькі”. Яшчэ адзін тэатр вогненных і светлавых відовішч “Элементаль” – гэта саюз таленавітых артыстаў, лаўрэатаў і ўдзельнікаў міжнародных конкурсаў,пад кіраўніцтвам Паўла Абакумава. На сеннешні дзень 7 чалавек займаюцца асабіста фаер-шоў і могуць прапанаваць сольнае і групавое выступленне, неон-шоў. Кожны нумар – гэта гісторыя, відовішча і незабыўная атмасфера агню,створанае на высокім узроўні. Тэатр з’яўляецца дыпламантам VIII гарацкога фестываля моладзі эстраднага мастацтва “Белая Русь”.

Агністыя шоў на вялікім пляцы ў Беларусі – гэта заўсёды незабыўнае відовішча для публікі. Пастаноўка такога фаер-шоў проста абавязвае выкарыстоўваць увесь набор піратэхнікі, спецэфектаў, піратэхнічных канструкцый, а таксама элементаў паркавай піратэхнікі. Кваліфікацыя і прафесіяналізм артыстаў, тэхнікаў, рэжысёраў, харэографаў дазваляе ствараць незвычайнае фаер-шоў з суцэльным малюнкам, вобразным шэрагам. Галоўны дзейсны персанаж тут - агонь, які гуляе ў замкнёнай прасторы, візуальна створанымі спецэфектамі, дэкарацыямі. Гледачы, змешчаныя непадалёк ад месца дзеяння, успрымаюць фаер-шоў як нешта дзіўнае, пры гэтым эфект свята надоўга застаецца ў памяці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У нашай краіне фаер-шоў рэдка расцэньваецца як элемент культуры, хутчэй успрымаецца як камерцыйная дзейнасць, можна не толькі ажыццявіць заказ артыстаў арыгінальнага жанру, але і ўзгадніць з імі праграму фаер-шоў, выказаць свае ўласныя пажаданні з улікам асаблівасцяў будучага свята. Гледачы будуць пагружаны ў атмасферу таямнічасці, якую артысты здольныя стварыць для любой аўдыторыі. Не меншае ўражанне, чым само шоў вырабляюць незвычайныя гарнітуры артыстаў, якія дапаўняюць сабой магію полымя.

Сення фаер-шоў выкарыстоўваецца беларускімі рэжысёрамі вельмі рэдка з-за адсутнасці ведаў у гэтым накірунку мастацтва, але сучасная навука і тэхніка дазваляе рэжысёру выкарыстоўваць фаер-шоў як адну з самых эмацыйных і вобразна сімвалічных формаў свята. Вывучэнне гэтай тэмы вельмі важна для нашай краіны, бо выкарыстанне фаер-шоў дапаможа рэжысёрам зрабіць святы больш яркімі і запамінальнымі. Звязана гэта з тым, што магічная сіла агню спрадвеку адначасова і вабіла, і палохала чалавека, а абрадавыя містэрыі і культавыя рытуалы з агнём зачароўвалі людзей на працягу тысячагоддзяў. Фаер-шоў у асноўным ажыццяўляецца рэжысерам на вялікіх святах толькі як састаўная частка. У яго есць і будуць вялікія перспектывы толькі тады, калі мы навучымся выкарыстоўваць традыцыі вогненных дзей. Правільна падабраўшы тэматычную музыку, распрацаваўшы эпізоды пластыка-вогненнага дзеяння і іх вобразнае вырашэнне, стварыўшы нумары ,рэквізіт, касцюмы і бутафорыю, можна зрабіць чароўнае незабыўнае відовішча, якое акажа вялікае эмацыянальнае і педагагічнае ўздзеянне на гледачоў.

Спіс выкарастанай літаратуры:

1.http://ru.wikipedia.org

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ